На протяжении дня работали разные по форме и содержанию выставки о жизни и творчестве Ивана Шамякина: **витражная выставка** «Читайте Шамякина – познавайте жизнь», **выставка-инсталляция** «Вечерами с Шамякинам», **интерактивная выставка** «Читай, Шамякина» и, конечно же, **виртуальная комната** «Иван Шамякин. Талант, неподвластный времени».

И это только часть юбилейных мероприятий. На протяжении 2021 года, как реальных, так и виртуальных читателей ждут теплые встречи с книгами Ивана Петровича Шамякина.

Все мероприятия, будущие и прошедшие, можно отследить по хештэгу, #Про100читайШамякина.

## ВЫВУЧЭННЕ Ў ШКОЛЕ МАНАГРАФІЧНАЙ ТЭМЫ «ІВАН ШАМЯКІН» ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭХНАЛОГІІ ПРАЕКТАЎ

**П. М. Ушкевіч**

*Дзяржаўная установа адукацыі «Сярэдняя школа № 6 г. Гродна», вул. Пралетарская, 69, 230003, Гродна, Беларусь,* belarustut@gmail.com

Артыкул прысвечаны разгляду асаблівасцяў вывучэння ў школе манаграфічнай тэмы «Іван Шамякін» з дапамогай тэхналогіі праектаў. Даказана, што пры вывучэнні дадзенай тэмы ад навучэнцаў патрабуецца валоданне цэлым наборам творчых, пазнавальных і арганізацыйных уменняў, якія паспяхова фарміруюцца якраз у працэсе іх праектнай дзейнасці. Такі падыход дае падлетку магчымасць паверыць у свае сілы і здольнасці, падводзіць яго да ўсведамлення неабходнасці ўласнага руху, росту, пошуку, развіцця. Выхаванец выпрацоўвае ў сябе самастойнасць, мэтанакіраванасць, уменне прымаць рашэнне і несці за яго адказнасць.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; манаграфічная тэма; вывучэннне ў школе; тэхналогія праектаў.

У школе Іван Шамякін даўно карыстаўся цікавасцю ў вучняў, таму што ні ў Янкі Брыля, ні ў Васіля Быкава, ні ў Івана Мележа няма падрабязнага апісання вобразаў моладзі, далучанасці да праблем маладога пакалення, іх трывог, перажыванняў, эмацыйнага стану. У творах пералічаных беларускіх класікаў галоўныя героі, як правіла, людзі сталага ўзросту, а ў творы Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» Славік Шыковіч успрымаецца як сучаснік сённяшніх навучэнцаў. У вобразе Славіка Шыковіча з рамана «Сэрца на далоні» ўвасоблена пісьменніцкая думка пра тое, як нялёгка быць маладым. Вельмі актуальная тэма для маладога пакалення XXI стагоддзя.

Так, у школе для вывучэння манаграфічнай тэмы «Іван Шамякін» найбольш падыходзіць праектная тэхналогія, якая дае магчымасць аб’яднаць у адно цэлае разнастайныя інтарэсы навучэнцаў, жаданні, здольнасці, выніковасць працы і засваення ведаў.

Адзначым, што тэхналогія праектаў вельмі ўдала накладваецца на вывучэнне любых манаграфічных тэм. У змест праекта можна ўключыць увесь матэрыял тэмы. Працуючы над праектам, навучэнцы могуць самастойна разважаць, праяўляць ініцыятыву, генерыраваць ідэі, бачыць і вырашаць праблемы, ставіць мэты, праяўляць лідарскія якасці, атрымліваць веды з розных крыніц, прагназаваць вынікі, прадугадваць магчымыя наступствы розных варыянтаў рашэння праблем, вызначаць прычынна-выніковыя сувязі, абагульняць, сістэматызаваць інфармацыю.

Метад праектаў – гэта сістэма навучальна-пазнавальных прыёмаў, якія дазваляюць вырашыць тую або іншую праблему ў выніку самастойных і калектыўных дзеянняў навучэнцаў з абавязковай прэзентацыяй вынікаў іх работы. Гэты метад прадугледжвае выкарыстанне выкладчыкам пры праектаванні і ажыццяўленні адукацыйнага працэсу асабіста-арыентаванага падыходу,

які падтрымліваецца, апрача агульнапрынятых, дыдактычнымі прынцыпамі [1, с. 58].

Даследаванне манаграфічнай тэмы «Іван Шамякін» (5 урокаў) праз выкарыстанне тэхналогіі праектаў варта распачаць з вывучэння асобных тэматычных блокаў.

Першы блок – знаёмства з жыццём і творчасцю Івана Шамякіна. У гэты блок уваходзяць наступныя раздзелы: біяграфічныя звесткі (першая група вучняў), мастацкая спадчына пісьменніка (другая група), прызнанне творчых заслуг (трэцяя група).

Для першай групы навучэнцаў – бібліёграфаў – мэтазгодна падрыхтаваць прэзентацыю пра жыццё пісьменніка. Гэта можа быць завочнае падарожжа, анлайн-экспедыцыя па жыццёвых сцежках Івана Шамякіна, гульня-падарожжа ў выглядзе прэзентацыі, вэб-квэст.

Для другой групы вучняў цікавай і незвычайнай формай прэзентацыі творчай спадчыны пісьменніка, на нашу думку, з’яўляецца выкарыстанне глог-плакатаў. Глогі – гэта інтэрактыўныя мультымедыйныя выявы. Падобныя да плаката, але карыстальнікі могуць узаемадзейнічаць з яго зместам. У працэсе навучання інтэрактыўны плакат дазваляе дасягнуць важных адукацыйных вынікаў: за кошт выкарыстання інтэрактыўных элементаў, каб прыцягнуць навучэнца ў працэс атрымання ведаў; за кошт выкарыстання разнастайных мультымедыа дабіцца максімальнай нагляднасці інфармацыі.

Роля выкладчыка ў тым, што ён стварае праблемную сітуацыю, якая дазваляе сфармуляваць актуальную і цікавую навучэнцам тэму для вывучэння і даследавання, прадстаўляе вучням магчымасць для выбару тэмы праекта, арганізуе размеркаванне падтэм па групах, роляў і функцый у групе, дапамагае выяўленню ў навучэнцаў пошукавай актыўнасці ў іх даследчай дзейнасці, заахвочвае і падтрымлівае выкарыстанне падлеткамі розных напрамкаў пошуку інфармацыі, розных метадаў даследавання, кансультуе навучэнцаў на ўсіх этапах работы, арганізуе падвядзенне вынікаў прамежкавых этапаў работы, дае дзецям магчымасць для самаацэнкі самастойна выкананых праектаў і работы над імі [2, с. 6].

Трэцяя група навучэнцаў рыхтуе матэрыял па прызнанні творчых заслуг пісьменніка. Можна прадэманстраваць урыўкі з кінастужак па творах Івана Шамякіна («Вазьму твой боль», «Гандлярка і паэт», «Глыбокая плынь» і інш.), зрабіць агляд тэатральных пастановак, прэзентацыю прэмій і ўзнагарод пісьменніка.

*ДАВЕДКА*

*1964 год – «Крыніцы» (па матывах рамана «Крыніцы», рэжысёр Іосіф Абрамовіч Шульман, «Беларусьфільм»). 1964 год – радыёспектакль «Сэрца на ладоні» (па матывах рамана «Сэрца на далоні», рэжысёр Віктар Рыгоравіч Карпілаў, «Беларускае тэлебачанне»). 1973 год – «Хлеб пахне порахам» (па матывах аповесці «Эшалон у Германію», рэжысёр Вячаслаў Аляксандравіч Нікіфараў, «Беларусьфільм»). 1978 год – «Гандлярка і паэт» (экранізацыя аповесці «Гандлярка і паэт», рэжысёр Самсон Іосіфавіч Самсонаў, «Масфільм»). 1980 год – «Атланты і карыятыды» (экранізацыя рамана «Атланты і карыятыды», рэжысёр Аляксандр Захаравіч Гутковіч, 8 серый, «Белтэлефільм»). 1980 – «Вазьму твой боль» (па матывах рамана «Вазьму твой боль», рэжысёр Міхаіл Мікалаевіч Пташук, «Беларусьфільм»). 1980 – «Вясельная ноч» (па матывах аповесці «Шлюбная ноч», рэжысёр Аляксандр Якаўлевіч Карпаў, «Беларусьфільм»). 1994 – «Эпілог» (па матывах аповесцей Івана Шамякіна, рэжысёр Ігар Міхайлавіч Дабралюбаў, «Беларусьфільм»). 2005 – «Глыбокая плынь» (па матывах раманаў «Снежныя зімы» і «Глыбокая плынь», рэжысёр Маргарыта Наімаўна Касымава і Іван Міхайлавіч Паўлаў, УП «Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм»).*

Другі тэматычны блок – уводны ўрок па раману «Сэрца на далоні». Група «гісторыкаў» рыхтуе матэрыял па гісторыі стварэння рамана.

*ДАВЕДКА*

*Іван Шамякін працаваў над раманам «Сэрца на далоні» ў 1960 – 1963 гадах. Спачатку твор быў надрукаваны ў часопісе «Полымя», а ў 1964 годзе з'явілася яго асобнае выданне. Па словах аднаго з галоўных герояў рамана журналіста Кірыла Шыковіча, гэта быў час*

*«пераваротy ў мазгах». Менавіта другая палова 50-х і першая палова 60-х гадоў сталі часам перамен у грамадстве, часам выкрыцця культу асобы Сталіна, аднаўлення ленінскіх (на тыя гады – дэмакратычных) нормаў жыцця. Нездарма гэты час назавуць «хрушчоўскай адлігай», бо сапраўды пасля XX з'езда КПСС (1956 год) у грамадстве «пацяплела»: адбывалася своеасаблівае «ўзвышэнне чалавека», зварот да паказу жыцця простых людзей, іх надзённых клопатаў, удзелу ў грамадскім жыцці.*

Задача «гісторыкаў» – зразумець сутнасць таго часу, даць інфармацыю пра гістарычнае аблічча твора, сацыяльнае асяроддзе, калі ўвесь калектыў адказваў за сваіх членаў, сяброў, аказваў дапамогу, не пакідаў у бядзе і заўсёды імкнуўся прыйсці на дапамогу, перажываў за вынікі працы. Для сённяшніх вучняў – гэта гісторыя, з якой можна ўзяць шмат добрых прыкладаў для пераймання.

Трэці тэматычны блок – гэта праект у выглядзе графічнай нагляднасці сюжэтных ліній твора. Можна выкарыстоўваць схематычны паказ, галерэю вобразаў (асноўныя і другарадныя персанажы). Важна адзначыць, што раман складаецца з некалькіх сюжэтных ліній, якія пераклікаюцца паміж сабой. Гэта і ўзаемаадносіны сааўтараў кнігі пра падполле Гукана і Шыковіча, і ўзаемаадносіны бацькоў і дзяцей, і самастойны аповед пра Антона Яраша і Зосю Савіч. Першая група рыхтуе агульны матэрыял пра сюжэтныя лініі, галерэю вобразаў мастацкага твора, з дапамогай графічнай нагляднасці дэманструе класу інфармацыю, адказвае на пытанні настаўніка. Другая група ў выглядзе паведамленняў распавядае пра раманны лёс герояў. Трэцяя група рыхтуе табліцу пра вобразы маладога пакалення (характарыстыка, ключавыя словы, цытаты). Вельмі важна, каб навучэнцы зразумелі вобразы моладзі таго мінулага часу, асабліва Славіка Шыковіча, матывы яго ўчынкаў. Чацвёртая група, па магчымасці, прадэманструе тэатральную пастаноўку любога эпізода рамана са сваімі каментарыямі. Асобна трэба спыніцца і на з’яве «гуканаўшчыны», патлумачыць і прааналізаваць прычыны з’яўлення, негатыўны эфект, актуальнасць. Уся інфарамацыя сістэматызуецца, падводзяцца вынікі агульнай працы над трэцім тэматычным блокам.

| Сюжэтныя лініі рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» | | |
|---|---|---|
| «Шыковіч – Гукан» | «Яраш – Зося» | «Бацькі – дзеці» |

Чацвёрты тэматычны блок варта прысвяціць пошуку крытычнага матэрыялу пра твор Івана Шамякіна. Асобная група вывучае агляд творчасці Шамякіна ў інтэрнэце, іншыя знаёмяцца з крытычнымі матэрыяламі з фондаў бібліятэкі, трэцяя група чытае водгукі на яго твор, чацвёртая – выпісвае асобна думкі, меркаванні крытыкаў, літаратуразнаўцаў адносна творчасці пісьменніка.

Пры падвядзенні вынікаў, адбываецца сістэматызацыя матэрыялу, створаныя праекты ацэньваюцца, праводзіцца аналіз матэрыялаў. Прычым ацэньваецца не пэўная частка праекта ці той ці іншы від дзейнасці, а ўвесь праект. У якасці рэфлексіі можна прапанаваць завочную экскурсію. Пры арганізацыі такой працы выкладчык, напрыклад, прапануе ўдзельнікам праектных груп стварыць маршрутную карту «Творчасць Івана Шамякіна ў школе», дзе будуць пазначаны асноўныя кропкі, тэматычныя блокі, звязаныя з асобай пісьменніка.

Такім чынам, ад навучэнцаў патрабуецца валоданне цэлым наборам творчых, пазнавальных і арганізацыйных уменняў. Пры гэтым важна падкрэсліць, што такія здольнасці і ўменні паспяхова фарміруюцца якраз у працэсе праектнай дзейнасці навучэнцаў. Вучні, якія занятыя пэўным праектам, вучацца працаваць у камандзе, таму што абавязковае патрабаванне да праекта – спалучэнне індывідуальнай і групавой форм работы. Такі падыход дае падлетку магчымасць паверыць у свае сілы і здольнасці, падводзіць яго да ўсведамлення неабходнасці ўласнага руху, росту, пошуку, развіцця. Выхаванец выпрацоўвае ў сябе самастойнасць, мэтанакіраванасць, уменне прымаць рашэнне і несці за яго адказнасць.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Грынько М. У. Інавацыйны падыход да навучання літаратуры (на матэрыяле праектнай тэхналогіі) // Беларуская мова і літаратура. 2010. № 10. С. 57–59.

2. Руцкая А. В. Выкарыстанне новых тэхналогій пры вывучэнні літаратуры // Беларуская мова і літаратура. 2004. № 5. С. 5–7.